# На зорным шляху

**Святло сафітаў, напружанае чаканне, першыя акорды — і мы зноў на "Зорным шляху". Чацвёрты сезон самага народнага вакальнага шоу — гэта свежыя адкрыцці і эмоцыі. З 1 лістапада ў эфіры — галасы, што нясуць у сабе мару, надзею і музыку ад усяго сэрца.**

## ШУКАЕМ

Сёлета за ўдзельнікаў адказваюць пяць прадзюсараў — выдатныя артысты, кампазітары і сапраўдныя прафесіяналы: Яўген Алейнік, Андрэй Гузель, Валерый Шмат, Ірына Дарафеева, Тэа. Пяць розных музычных поглядаў звязаны адной мэтай — адкрыць новыя галасы краіны.

**Тэа** прызнаецца, што кастынгі сталі для яго сапраўдным падарожжам па краіне:

— Беларусь неверагодна таленавітая. Спяваюць усе — ад маладых да сталых. Даводзілася рабіць няпросты выбар, каго ўключыць у абмежаваную колькасць канкурсантаў. У трэніровачным лагеры многія пачыналі літаральна з нуля — вучыліся працаваць перад камерай, кантраляваць міміку і эмоцыі. Людзі, якія раней з гэтым не сутыкаліся, могуць добра спяваць, але выглядаць напружана. Цяпер усё інакш — бачны рэальны рост. Мая каманда плануе працягваць развіццё і далей.

Для спевака праект — і асабістае адкрыццё:

— Перад здымкамі бягу ў краму па каву і мясную нарэзку для сваіх падапечных. Напэўна, у гэтым і ёсць сутнасць працы прадзюсара — быць побач.

**Яўген Алейнік** падыходзіць да справы з педантычнай дакладнасцю:

— Мару, каб чацвёрты сезон падарыў краіне зорку нацыянальнага маштабу. У маёй камандзе — строгая дысцыпліна. Песні выбіраю сам. Спачатку ўдзельнікі былі незадаволеныя, але пасля першых здымак многія казалі: "Мы не думалі, што гэта — наша песня". А ў тым і сутнасць праекта — пакінуць зону камфорту і ўбачыць, на што ты здольны.

**Андрэй Гузель** робіць стаўку на індывідуальнасць:

— Цяпер менш гутарак і больш музыкі. Глядач павінен бачыць не настаўніка, а таленты. Мы не ломім артыстаў, а дапамагаем ім раскрыцца. Наша задача — стварыць умовы, у якіх чалавек адчуе сябе свабодна і арганічна. Пакуль паказваем асоб — у паўфінале будзем здзіўляць пастаноўкамі.

## СТВАРАЕМ

За кулісамі праекта, арганізаванага тэлеканалам АНТ, "Музычнай медыякампаніяй" і Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, кіпіць праца. У павільёне кінастудыі "Беларусьфільм" узведзены дэкарацыі, дзе кожны метр сцэны дыхае энергіяй мастацтва. Кожны нумар — вынік дзясяткаў рэпетыцый і соцень абмеркаванняў. Дэталёва прадумваюцца і вакальныя партыі, танцы, і работа святла, камер, рух рэквізіту.

Галоўны рэжысёр "Зорнага шляху" **Ілья Баранаў** падкрэслівае: у новым сезоне каманда пайшла на смелы творчы крок.

— Павялічылі колькасць нумароў па просьбах гледачоў. Хацелася, каб у эфіры гучала больш музыкі, — расказвае рэжысёр. — Калі раней у паўфіналах было каля 30 выступленняў, цяпер — 60. Спачатку здавалася, што гэта непад'ёмна, але дзякуючы агульнаму настрою прадзюсараў, харэографаў і пастаноўшчыкаў нам удалося справіцца.






## АДКРЫВАЕМ

Да выхаду на сцэну рыхтуюцца канкурсанты з усіх рэгіёнаў Беларусі. У грымёрках і пакоях чакання — рабочыя, студэнты, настаўнікі. Кожны з іх прынёс сваю гісторыю, мае свой шлях да песні.

**Ілья Клімкін** з Жыткавічаў — мастацкі кіраўнік раённага Цэнтра культуры. Пра кастынг даведаўся, калі рассылаў афішы па арганізацыях, і вырашыў запоўніць анкету сам.

— На сцэне я даўно, але як вакаліст — толькі год, — расказвае Ілья. — Не вучыўся спяваць прафесійна, усё — ад прыроды: голас, слых. Валерый Шмат заўважыў мяне і прапанаваў выканаць песню ў джазава-рокавай апрацоўцы. Гэта выклік, бо я прывык да лірычных кампазіцый. Але ў тым і сэнс праекта — пераадольваць сябе і адкрываць новыя магчымасці.

З упэўненасцю і агеньчыкамі ў вачах да выхаду ўжо гатовая **Вольга Шэнец** са Светлагорска — удзельніца каманды Андрэя Гузеля.

— Прадстаўляю Гомельскую вобласць і родны цэлюлозна-кардонны камбінат. Адказнасць — неверагодная. Шмат працавалі з педагогамі над вакалам, дыкцыяй, сцэнічнай пластыкай. Цяпер магу сказаць: я вырасла. Гэта каштоўны вопыт, які застанецца са мной назаўжды. Мы — самародкі, спяваем ад сэрца і гэтым жывём.



## ПАДТРЫМЛІВАЕМ

Асобная плынь падзей віруе ў фае — там, дзе эмоцыі гусцеюць у паветры, а хваляванне змяняецца верай у поспех. Плакаты, шары, лозунгі з імёнамі ўдзельнікаў — гледачы збіраюцца цэлымі групамі, каб выказаць прыхільнасць.

— Прыехалі з Мазыра падтрымаць нашых дзяўчат Алесю Кавалевіч і Сняжану Кананові, — расказвае **Таццяна Гузева**, хормайстар народнага ансамбля "Радуніца". — Для іх гэта вялікі шанс, і мы перажываем за кожную ноту, нібы самі выходзім на сцэну.

Сярод гледачоў — і будучыя артысты, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

— Завіталі, каб падтрымаць нашу выкладчыцу Ірыну Дарафееву, — кажа **Лізавета Дашчынская**. — Вучымся на кафедры эстраднай музыкі, спецыяльнасць — вакал. Таму нам асабліва цікава бачыць, як робіцца шоу, як нараджаецца атмасфера свята. Тут — сапраўдны творчы свет, і мы хочам стаць яго часткай.

"Зорны шлях" — месца, дзе сустракаюцца вопыт і мара, дзе сцэна напаўняецца шчырымі эмоцыямі, а звычайныя людзі з самых розных куткоў краіны раскрываюць у сабе артыстаў. Сезон толькі пачаўся, наперадзе паўфіналы, фінальныя здымкі і, вядома, новыя таленты. Але ўжо сёння відавочна: праект працягвае выконваць галоўную місію — аб'ядноўваць Беларусь пад сцягам музыкі.



**Ганна КАЛІНІНА**
Фота аўтара